http://edoc.bseu.by:8080

*В.М. Губская*
*УА БГЭУ (г. Мінск)*

# ЛІТАРАТУРА НОВАГА КІТАЯ І НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ЯК ЭТАПНЫЯ З’ЯВЫ КУЛЬТУРЫ

Літаратура – гэта сегмент культуры, у якім не толькі адлюстроўваюцца схільнасці народа да творчаці, але і фіксуецца стаўленне чалавека да той ці іншай гістарычнай падзеі. Па сутнаці, літаратура – люстэрка гісторыі, і нават калі выява скажоная, пераламленне, якое ўзнікае на мяжы рэальнага і мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, часта стварае дзіўны эфект, адсылаючы чытача да разважання пра прычыну яго ўзнікнення. Відавочна, што нас будзе цікавіць уплыў гістарычных падзей на фарміраванне і развіццё літаратуры, іншымі словамі, літаратурная рэфлексія на гістарычныя падзеі.

Паралель Новай беларускай літаратуры і літаратуры Новага Кітая, на першы погляд, алагічная: дзве розныя культуры, якія пачалі фарміравацца ў розны час, ды яшчэ і абапіраючыся на розныя фальклорныя традыцыі. Але ж не трэба рабіць хуткія высновы. Безумоўна, мы не прэтэндуем на тыпалагічнае супастаўленне, але звычайнай кампаратывістыкай заняцца цалкам магчыма. Што ж можа аб’яднаць гэтыя дзве такія, на першы погляд, далёкія культурныя з’явы? У адказ прывядзем тры ключавыя паняцці: «імперыялізм», «патрыятызм», «марксізм».

У гісторыі Кітая ёсць шмат знакавых, паваротных падзей, сярод якіх не апошняе месца займае «Рух 4 мая» – антыімперыялістычны выступ, які адбыўся ў маі-чэрвені 1919 года пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэта была рэакцыя моладзі на саступкі кітайскага ўрада каланіяльным дамаганням Японіі на Версальскай канферэнцыі, якая выклікала беспрэцэдэнтны ўздым нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму. Але ж па сутнасці гэты рух азначаў змену ў поглядах кітайскай інтэлігенцыі, масавую пераарыентацыю з традыцыйнай культуры на вестэрнізацыю. «Рух 4 мая» закрануў усе бакі інтэлектуальнага жыцця Кітая, у тым ліку мову і літаратуру. Пашырылася і з цягам часу замацавалася выкарыстанне размоўнай мовы «байхуа», якая замяніла класічную кніжную мову «вэньянь», валоданне якой патрабавала спецыяльнай падрыхтоўкі.

У пачатку XX ст. у краіне ўжо існавалі перыядычныя выданні на «байхуа», але ж у перыяд «Руху 4 мая» іх колькасць рэзка павялічылася. Восенню 1920 г. выкладанне ў школах і ВНУ было пераведзена на «байхуа», якая заняла статус афіцыйнай літаратурнай мовы. Аднак барацьба прагрэсіўнай інтэлігенцыі была не толькі супраць састарэлых нормаў класічнай мовы, элітарнай літаратуры, але і супраць афіцыйнай ідэалогіі імператарскага Кітая – канфуцыянства, якое, на іх погляд, увасабляла рабскую пакорлівасць. Іншымі словамі, «Рух 4 мая» адыграў значную ролю ў развіцці пачуцця патрыятызму сярод усяго асяроддзя кітайскага грамадства і паскорыў распаўсюджванне марксізму.

А зараз звернемся да гісторыі Беларусі. Агульнавядома, што Беларусь працяглы перыяд знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, маючы назву Паўночна-Заходні край. Дзяржаўнай мовай лічылася руская, беларуская ж, прыйшоўшы ў поўны заняпад, захавалася толькі ў вусным маўленні простых людзей. Па сутнасці, гэта сітуацыя нагадвае гісторыю «байхуа», якая кантраставала на фоне элітнай «вэньянь»; ды і Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая падштурхнула кітайскі народ да «Руху 4 мая», накіравала гісторыю Беларусі на ўласны шлях развіцця. Разважаючы пра Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 года, хочацца звярнуцца да працы Ю.М. Лотмана «Механізм смуты», у якой ён разглядае дынаміку бінарнай і цернарнай сацыяльных структур. Канцэптуальная ідэя, неабходная нам для далейшых разважанняў, заключаецца ў тым, што характар рэвалюцыі ў бінарнай і цернарнай сістэмах розны: «У цернарных структурах размеркаванне элементаў нераўназначнае. На паверхні гістарычнага соцыуму выступае нейкая канфліктная пара. Менавіта яна задае эпосе яе асноўнае гучанне... Трэці элемент культуры знаходзіцца ў гэтым выпадку ў спантанным стане. Ён схаваны ў глыбінях канфлікту і прымыкае, як правіла, да адной з дамінуючых тэндэнцый, часам афарбоўваючыся ў яе тон і ўспрымаючы яе праграму. Але ў крытычныя, крызісныя моманты, калі барацьба паміж дамінуючымі сіламі заводзіць іх у тупік, з якога яны не могуць знайсці выйсця, і перад грамадствам пачынае вымалёўвацца аблічча катастрофы, «трэцяя сіла» раптам выходзіць на паверхню, ужо дастаткова саспелая і гатовая заняць вядучае месца ў гісторыі. У падобных структурах выбух не носіць характару ўсеагульнай катастрофы – у ім вылучаецца стваральная сіла: яна расчышчае «аўгіевы стайні» гісторыі і адкрывае шлях яе новаму этапу» [1, с. 34].

З улікам вышэй сказанага хочацца выказаць меркаванне, што і беларускае грамадства перыяду Рускай рэвалюцыі 1917 года, і кітайскае грамадства перыяду «Руху 4 мая» 1919 года можна аднесці да цернарнай сацыяльнай структуры. А новым этапам у гісторыі можна беспамылкова назваць фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і шлях да нацыянальнага станаўлення. Варта адзначыць яшчэ і тое, што і беларускі народ, і кітайскі не пакідалі спадзяванні на ўздым нацыянальнага адраджэння не губляючы пры гэтым веры ў сілу марксізму і бальшавіцкую ідэалогію, тым больш, што ў 1919 годзе была створана БССР, а ў 1920-я гады пачаўся росквіт беларусізацыі, якая, у сваю чаргу, спарадзіла актыўны літаратурны рух. Газета «Наша ніва», якая выходзіла рэгулярна з 1906 па 1915 г., была дзейсным сродкам уплыву на грамадскае жыццё, бо ставіла за мэту абудзіць і ўзняць беларускі народ з гістарычнага нябыту і такім чынам выканаць сваю асветніцка-адраджэнцкую місію. Менавіта на старонках гэтай газеты вяліся літаратурныя дыскусіі і друкаваліся творы маладых літаратараў. З 1920 па 1926 г. распачалі сваю дзейнасць больш за 500 беларускіх літаратараў. У 1923 годзе ўтварылася суполка «Маладняк», якая ў выніку свайго развіцця абрала шлях збліжэння з агульнай бальшавіцкай пазіцыяй. «Маладняк» ствараў новую, пралетарскую літаратуру. Найбольшыя дасягненні былі ў галіне паэзіі, што мела рэвалюцыйна-рамантычны характар і трымалася на пафасе адмаўлення «старога». Пераважала захапленне псеўдарэвалюцыйнай фразеалогіяй, што выяўлялася ў выкарыстанні палітычных лозунгаў і прапагандысцкіх штампаў, заўважалася пагоня за экстравагантным словам, імкненне супрацьстаўляць новы стыль састарэлай «нашаніўскай» манеры. У 1926 годзе фарміруецца суполка «Узвышша», якая ставіць за мэту стварэнне высокамастацкай беларускай літаратуры, своеасаблівага літаратурнага ўзвышша. Задача літаратараў была не простай – сфарміраваць нацыянальную самасвядомасць беларускага народа, пашырыць беларускі нацыянальна-культурны рух без палітыкі партыйнага кіраўніцтва. Прадстаўнікі літаратурнага згуртавання «Узвышша» абапіраліся на досвед французскіх паэтаў-парнаснікаў, часткова на праграму расійскіх імажэністаў і акмеітаў (С. Ясенін, М. Гумілёў, Г. Ахматава, В. Мандэльштам, Міхаіл Кузмін), на прынцып «чытае красы» (успрыняты М. Багдановічам), што

выявілася ў іх арыентацыі на выкшталцонасць і элітарнасць творчасці. У 1927 годзе на літаратурнай пляцоўцы ўзнікае яшчэ адна суполка – «Полымя», якая не адмаўлялася ад афармлення і замацавання ў беларускай літаратуры пралетарскай ідэалогіі, але ж імкнулася пры гэтым удасканальваць нацыянальную форму. Значная ўвага надавалася развіццю крытыкі, павышэнню прафесійнага ўзроўню членаў аб'яднання, беражліваму стаўленню да культурнай спадчыны. Аднак дамагчыся гэтага было складана з-за неаднароднасці складу аб'яднання, розных поглядаў і густаў яго членаў. Нярэдка палымянская крытыка была непаслядоўнай, неаб'ектыўнай у ацэнках літаратурных з'яў.

У Кітаі ж ідэі марксізму сталі тым трывалым грунтам, на аснове якога ладзілася новае жыццё, як грамадскае, так і літаратурнае. Літаратурны рух таксама стракацеў ад разнастайных творчых ідэй і напрамкаў іх рэалізацыі. Рэалістычны кірунак на чале з Лу Сінем развіваўся ў рэчышчы расійскай, а пазней і савецкай літаратуры; кірунак Ху Шы – у рэчышчы амерыканскага прагматызму, яшчэ адзін кірунак развіваўся, у асноўным, пад уздзеяннем рамантызму Заходняй Еўропы і звязаны перш за ўсё з імем Го Мажо і дзейнасцю грамадства «Творчасць».

Падыходзячы да высноў, хочацца адзначыць наступнае: якімі б рознымі ні былі краіны, культуры і традыцыі, існуе пэўная заканамернасць у іх гістарычным станаўленні. Любы народ не жадае быць зняволеным. Калі браць пад увагу тэорыю пасіянарнасці Гумілёва, заўсёды надыходзіць момант пасіянарнага ўздыму. Літаратура – той пергамент, які фіксуе любыя, нават самыя нябачныя і нязначныя для абывальніка зрухі грамадства, прадыктаваныя абранай палітычнай ідэалогіяй. Так гістарычна склалася, што лёсавызначальнымі для абедзвюх краін сталі ідэі марксізму, бальшавізму. І вось тут праяўляецца ўнікальная функцыя літаратуры, сутнасць якой у фіксацыі кожнага ідэйнага руху грамадства, кожнай дробнай, для вялікай гісторыі нязначнай ідэі. Менавіта праз літаратуру і яе напрамкі можна прасачыць, куды імкнецца сацыяльная большасць.

## Літаратура

1. Лотман, Ю. История и типология русской культуры / Ю. Лотман. – С.-Пб.: Искусство-СПБ, 2002. – 768 с.